# І творчасць, і майстэрства

***У бібліятэцы Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання 14 красавіка адбылася літаратурная сустрэча з былым выкладчыкам Магілёўскага бібліятэчнага каледжа імя А.С. Пушкіна, беларускім пісьменнікам, краязнаўцам Віктарам Арцем'евым.***



Віктар Іванавіч прэзентаваў студэнтам універсітэта і сваім былым навучэнцам тры новыя творчыя працы.

Гэта зборнік «Пісьменнікі і кнігі», які выйшаў з друку ў канцы 2015 г. і надрукаваны ў друкарні Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова. Ён стаў своеасаблівым летапісам літаратурнага жыцця магілёўскага краю. У кнігу ўключаныя нататкі, успаміны і эсэ пра сустрэчы з многімі вядомымі пісьменнікамі, згадкі да юбілеяў паэтаў і празаікаў, артыкулы пра кнігі літаратараў-землякоў, тэксты арыгінальных аўтографаў беларускіх пісьменнікаў пра кнігу, лісты Аляксея Пысіна і Янкі Брыля, эсэ-фэнтэзі «Магілёўская абласная бібліятэка ў пачатку XXII стагоддзя». У зборніку змешчаныя артыкулы і нататкі пра Міколу Аўрамчыка, Рыгора Барадуліна, Янку Брыля, Аляксандра Вампілава, Ніла Гілевіча, Якуба Коласа, Янку Купалу, Аркадзя Куляшова, Івана Мележа, Івана Шамякіна, Ігара Шклярэўскага, Яўгенію Янішчыц і іншых (усяго 25 імёнаў і 13 крытычных артыкулаў). Магілёўскаму паэту прысвечаны раздзел «Вянок Аляксею Пысіну». З усімі, аб кім напісаў аўтар, ён быў альбо добра знаёмы, альбо вёў сяброўскую перапіску. У навукова-папулярным выданні таксама змешчаныя фотаздымкі з пісьменнікамі з архіва аўтара. На вокладцы зборніка размешчаныя 23 партрэты пісьменнікаў і вывы ўсіх 20-і вокладак кніг В. Арцем'ева.

Потым Віктар Іванавіч пазнаёміў прысутных з сігнальным выданнем новага зборніка – «Песняр зямлі магілёўскай», у які ўвайшлі яго нарысы аб жыцці і творчасці вядомага паэта Беларусі і Расіі Івана Пехцерава і рэцэнзіі на спектакль па драматычнай паэме «Ці не на крыві, а на любові», а таксама на кнігі, выдадзеныя ў Беларусі ў 2003 – 2012 гг.: «Лугавыя росы», «Мёртвыя сораму не імуць», «Святыні сэрца майго», «Васільковае слова палёў», «Акно ва ўсе часы», «Нябесныя браты», «Зямля між рэчак Іпуць і Лобжанка», «Святло Радзімы». У канцы зборніка дадаткам змешчаныя 70 лепшых вершаў з гэтых кніг і 11 з яго рукапісаў апошняга паўгода зямнога шляху паэта. Кніга прызначаная для шырокага кола маладых паэтаў, філолагаў, літаратараў-краязнаўцаў, а таксама будзе цікавая студэнтам і навучэнцам старэйшага школьнага ўзросту. Віктар Іванавіч з новага зборніка прачытаў аўдыторыі не публікаваныя раней вершы І. Пехцерава.

Таксама В. Арцем'еў пазнаёміў з сваёй публіцыстыкай, апошнім артыкулам «Прыйшла Еўропа да Дунькі», які выклікаў бурнае абмеркаванне ў аўдыторыі.

Да сустрэчы супрацоўнікамі бібліятэкі была аформлена кніжная выстава «І творчасць, і майстэрства», дзе былі прадстаўленыя літаратурныя творы нашага земляка.

*Ірына СІВЯНКОВА, загадчыца бібліятэкі МДУХ*